З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

# А ШТО ПАСЛЯ ДАЖЫНАК?

## Раённая камісія па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання вывучала сітуацыю з добраўпарадкаваннем у Высокім

**Пастаянная камісія Камянецкага раённага Савета дэпутатаў па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання на мінулым тыдні збіралася ў горадзе Высокае. Афіцыйна пытанне, якое вынеслі на разгляд, гучала так: «Аб мерах, якія прымаюцца Высокаўскім гарадскім Саветам дэпутатаў, па забеспячэнні годных умоў пражывання і жыццядзейнасці насельніцтва».**

— А калі гаварыць прасцей, мы сабраліся з дэпутатамі, каб паглядзець, што зроблена ў горадзе пасля дажынак 2018 года, як развіваецца 5-тысячны населены пункт, — сказала карэспандэнту «МС» **старшыня камісіі Людміла ЖУРАЎЛЁВА.** — Зразумела, што пад дажынкі былі выдзелены значныя сродкі, і невялікі горад перажыў абнаўленне. Многа было зроблена па замене інжынерных камунікацый, праведзены рамонт часткі жылога фонду, шмат зроблена ў плане добраўпарадкавання вуліц, двароў. Але не менш важна, каб з мерапрыемствамі «пад дажынкі» клопаты пра знешні выгляд, якасць жыцця людзей не заканчваліся.

Вось на гэта і звярнулі асаблівую ўвагу дэпутаты, наведваючы шэраг аб'ектаў. **Старшыня Высокаўскага гарвыканкама Аляксандр РАГАЛЬЧУК** расказаў дэпутатам, якая работа вядзецца па добраўпарадкаванні, як у гэтай рабоце ўдзельнічаюць самі гараджане. Штогод праводзяцца суботнікі, высаджваюцца кветкі на клумбах, садзяцца маладыя дрэвы і кусты, паляпшаюцца дарогі і двары.

Яшчэ да дажынак была адрамантавана і мадэрнізавана школа разам са школьнай тэрыторыяй. А летась работу працягнулі. Быў праведзены капітальны рамонт з мадэрнізацыяй стадыёна Высокаўскай сярэдняй школы (другі пускавы комплекс). Уладкаваны футбольнае поле, пляцоўкі для скачкоў у даўжыню, бегавыя дарожкі, сектар для кідання кап'я. Цяпер вучні могуць займацца ў секцыях па многіх відах спорту.

Уведзены ў эксплуатацыю жылы дом па вуліцы Сацыялістычнай. ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь» прафінансавала закупку і ўстаноўку дзіцячага гульнявога комплексу ў двары дома. Яшчэ адзін комплекс паставілі паміж дамамі па вуліцы Зоі Касмадзям'янскай і інтэрнатам па вуліцы 60 гадоў Кастрычніка. Грошы на пакупку апошняга ўдалося выручыць з аўкцыёну па продажы зямельных участкаў, якія канфіскуюцца ў гаспадароў, што так і не распачалі будаўніцтва. На чэрвень зноў прызначаны такі аўкцыён. Выручаныя сродкі плануецца патраціць на пакупку лавак, сметніц, устаўляванне пясочніцы для дзяцей.



У адказ на звароты выбаршчыкаў уладкавана месца для сезоннага гандлю прадукцыяй, вырашчанай на прысядзібных участках.

Падчас работы дэпутаты засяродзілі ўвагу і на тых пытаннях, што яшчэ не вырашаны і застаюцца на кантролі. Найперш гэта асфальтаванне вуліц Свярдлова, Гагарына, Заслонава, Кірава, Арджанікідзе, Мяжэніна, Беларускай. Вулічнае асвятленне патрабуецца на дваровай тэрыторыі трох дамоў па вуліцы Будаўнікоў. Квартал жылой забудовы ў раёне вёскі Кавалікі неабходна падключыць да цэнтральнай каналізацыі. Работа па вырашэнні пытанняў будзе прадоўжана, запэўніў кіраўнік мясцовай улады ў Высокім.

Як адзначыла **старшыня Камянецкага раённага Савета дэпутатаў Ірына НЕГЯРЫШ**, дэпутацкая камісія па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання працуе даволі эфектыўна. Усе яе пасяджэнні праходзяць з абавязковым выездам на месца. Дэпутаты сустракаюцца з людзьмі, інфармацыю атрымліваюць з першых вуснаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Камянецкі раён.*

**Фота з сайта газеты «Навіны Камянеччыны».**

# Асцярожна, «развод»!

## Тры разы правесці пыласосам па вентыляцыі — паслуга за 195 рублёў

**На днях да мяне завіталі нечаканыя госці. У дзверы кватэры пазванілі. На парозе стаялі два хлопцы ў цёмна-сініх куртках са святлоадбівальнікамі, пазначаныя бэйджыкамі. І самае дзіўнае, з пыласосам і нейкай палкай ці кіем у руках.**



Не паспела я і слова сказаць, як яны паведамілі: маўляў, мы па дагаворы з ЖЭСам будзем чысціць у вас вентыляцыю. І імкліва пакрочылі ў кухню.

Без майго дазволу хлопцы ўключылі пыласос, адзін з іх стаў на табурэтку, каб дацягнуцца да вентыляцыі. Я выключыла пыласос.

— Вы што, адмаўляецеся? У такім выпадку вам пагражае вялікі штраф, — пачалі палохаць яны.

— За што і ад каго? — запыталася я. — Ад вашай камерцыйнай фірмы? Але я не абавязана карыстацца паслугай, якую не заказвала. Па-першае, вы павінны праверыць цягу ў вентыляцыі, перш чым чысціць канал. А гэта планава робяць работнікі ЖЭСа, прычым бясплатна. І гэта простая працэдура. Да вентыляцыйнай рашоткі падносіцца запалка, якая гарыць, або чысты аркуш паперы. Нядаўна нас наведалі камунальнікі з планавай праверкай і ніякіх няспраўнасцяў не знайшлі. А калі б знайшлі, то папярэдзілі б уласнікаў, каб тыя тэрмінова выклікалі спецыялістаў адпаведнага профілю. Яны ажыццяўляюць прачыстку спецыяльным прыборам з даху або гарышча.

— Калі вы адмаўляецеся, мы выпішам вам штраф, — заладзілі нязваныя «госці». І сунулі пад нос нейкую паперчыну, нібыта дагавор на выкананне работ. Краем вока глянула ў гэты дакумент і вельмі здзівілася. Атрымліваецца, што я сама па сваёй добрай волі звярнулася па паслугу да гэтых «майстроў». А кошт паслугі яны ацанілі аж у 195 рублёў.

Я папрасіла камерсантаў пакінуць кватэру. Але яны і не збіраліся сыходзіць, спадзеючыся выпатрабаваць грошы ў «гэтай незгаворлівай жанчыны». І толькі калі я ўзяла ў рукі тэлефон і сказала, што выклікаю міліцыю, яны неахвотна пасунуліся да дзвярэй.

А праз колькі часу зноў нехта званіць. На парозе суседка — жанчына гадоў за семдзесят, якая пражывае адна ў двухпакаёўцы:

— Дзетачкі мае, якая ж я дурніца! Падпісала дагавор, аддала 195 рублёў, гэта амаль што палова маёй пенсіі. І за што? Яны ж некалькі разоў правялі пыласосам па вентыляцыі ды патыркалі туды нейкай палкай. І галоўнае, запатрабавалі разлічыцца наяўнымі грашыма.

Калі «майстры» пакінулі кватэру, жанчына вырашыла патэлефанаваць у ЖЭС, пацікавіцца, чаму такая дарагая паслуга. Ёй адказалі, што нікога не пасылалі для чысткі вентыляцыі. І тады да яе дайшло, што яе «развялі», як неразумнае дзіця.

«Як жа вярнуць грошы?» — лямантавала суседка. Мы параілі звярнуцца ў Таварыства абароны спажыўцоў. Магчыма, там дапамогуць, напішуць іск у суд. Але, як паказвае практыка, рэдка каму тое ўдаецца. Сам жа чалавек замацаваў дагавор уласным подпісам.

Як аказалася, такія масіраваныя «набегі» адбыліся ў кватэрах усяго пасёлка аўтазаводцаў, што ў Сталіцы. «Майстры» ходзяць звычайна ў рабочы час, калі дома застаюцца пенсіянеры ці маладыя мамы з дзецьмі. Іх лягчэй «апрацаваць», напалохаць штрафамі, а то і страшнымі наступствамі, калі адмовяцца ад паслугі. Маўляў, могуць адбыцца пажар, атручэнне газамі, якія назапашваюцца пры няспраўнай вентыляцыі. Але, запэўніваюць яны, няшчасце можна папярэдзіць. Толькі не трэба шкадаваць грошай, бо потым здароўя не купіш. А калі адбудзецца выбух, згарыць кватэра, давядзецца шукаць куток, туліцца па сваяках.

Сапраўды, навучаныя розным хітрасцям «спецыялісты» спачатку палохаюць людзей — кожны па сваім профілі. Напрыклад, так званыя фільтроўшчыкі — атручэннем ад спажывання няякаснай вады з крана, электрыкі — пажарам ад замыкання і г. д. Нягледзячы на тое што паслугі нятанныя, жыхары згаджаюцца за іх заплаціць. Работа зроблена. І нібыта ўсё па законе — дагавор жа заключаны. І толькі праз колькі часу разумееш, што зрабіў вялікую памылку. Як раяць людзі, якія трапілі ў падобную сітуацыю, перш чым пусціць у дом незнаёмцаў, трэба ўпэўніцца, што гэта не махляры, запатрабаваць пасведчанне. І калі засумняваліся ў іх праўдзівасці, званіць у ЖЭС. А калі і гэта не дапамагае, тэлефанаваць у міліцыю.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 3 чэрвеня 2021 года.